# ВОДГУК

на аўтарэферат дысертацыі Зяноўкі Яўгеніі Сяргееўны “Лінгваакустычныя рэсурсы для беларускамоўных сістэм сінтэзу маўлення: фарміраванне, прагматычны патэнцыял, спосабы аптымізацыі” на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасцях 10.02.01 – беларуская мова, 10.02.21 – прыкладная і матэматычная лінгвістыка

Актуальнасць даследавання відавочная і выклікана неабходнасцю канцэптуальнага погляду на прыроду прасадычнага працэсара ў машынных сістэмах, дзе інтанацыі належыць прыярытэтная роля ў якаснай арганізацыі штучнага маўлення.

Сучасны ўзровень лічбавых тэхналогій і іх паўсюднае ўкараненне ў сферы чалавечай дзейнасці робяць актуальнай арганізацыю зносін чалавека і камп’ютарных тэхналогій у адным з найбольш зручных для яго фарматаў – фаналагічным дыялогу на натуральнай мове. Шматгадовыя даследаванні, праведзеныя ў ХХ ст., дазволілі стварыць сінтэзатары, якія забяспечваюць якасць і распазнаванне маўлення, цалкам прыдатныя для шырокага спектру практычнага прымянення. Аднак сінтэзаванае маўленне па якасці заставалася толькі далёкім правобразам натуральнай мовы з моцным машынным акцэнтам. Прычынай гэтаму быў не ўзровень распрацоўкі асноў фанетыкі (якраз такія даследаванні сістэмна і паслядоўна вяліся з другой паловы ХХ стагоддзя ў адзеле эксперыментальнай фанетыкі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР), а недасканалыя тэхналагічныя магчымасці вылічальных рэсурсаў таго часу, якія максімальна прыраслі ў цяперашні час і не абмежаваны ні аб’ёмам аператыўнай памяці, ні патрэбным дыгіталізаваным аб’ёмам вылічэнняў, што дазваляе на якасна новым узроўні ствараць сістэмы сінтэзу маўлення па тэксце з максімальна магчымым набліжэннем па гучанні да голасу і манеры чытання прафесійнага дыктара.

Праведзенае даследаванне выходзіць за межы вузкаарыентаванага, на першы погляд, аб’екта вывучэння і ў цэлым падае панарамнае ўяўленне пра лінгваакустычныя, у прыватнасці, інтанацыйныя высновы тэкставай арганізацыі сучаснай літаратурнай мовы. Так, на аснове прааналізаванага тэкставага матэрыялу (350 сказаў) створана сістэма правіл і распрацаваны алгарытм для вызначэння інтанацыйных межаў у тэксце, акрэслены фармальныя паказчыкі для вызначэння сінтагмаў. Укараненне перадавых эксперыментальна-фанетычных метадаў дазволіла дысертанту адлюстраваць узорныя параметры фанетычных сродкаў, разнастайнасць вымаўлення сінтаксічна-акцэнтных адзінак, што ў сукупнасці ўтвараюць інтанацыю сказа.

Дэскрыптыўная характарыстыка індывідуальнай, эмацыянальнай і стылістычнай рэалізацыі беларускай інтанацыі, яе шматстайнасці – важкі

ўнёсак ў развіццё беларускага мовазнаўства, які арганічна ўвойдзе ў ланцужок айчынных даследаванняў і зойме годнае месца сярод лінгвістычных прац.

Вынікі дысертацыі Зяноўкі Яўгеніі Сяргееўны ўяўляюць сабой новыя практычныя рашэнні і тэарэтычныя веды, яны могуць выкарыстоўвацца як у далейшых лінгвістычных даследаваннях, у дыдактычных мэтах, а таксама ва ўдасканаленні тэлевізійнага маўлення, у павышэнні якасці радыйных перадач і ў прырошчванні акцёрскага майстэрства.

Дысертацыйнае даследаванне валодае высокай ступенню навуковай навізны, што прэзентуецца ў наступным: у арыентаваным выяўленні і камп'ютарнай апрацоўцы з прымяненнем сучасных праграм Sony Sound Forge, Praat, PitchPlotter і праграмнага комплексу «IntonTrainer» прасадычных характарыстык беларускай літаратурнай мовы; прэзентацыі меладычных партрэтаў сказаў паводле інтанацыйных канструкцый беларускай мовы, яе рытміка-інтанацыйных параметраў; класіфікацыі міжфразавых і міжсінтагменных паўз. Вынікова прымяняецца інавацыйная методыка даследавання і працэдурная арганізацыя спецыяльных міжгаліновых ведаў – лінгвістычных асноў беларускай прасодыі і камп'ютарных тэхналогій штучнага маўлення. Упершыню прадстаўлены статусныя падставы для вылучэння камбінаторыкі камп'ютарнай дэлімітацыі сінтагмаў і тыповых інтанацыйных мадэлей, што спрыяе пошуку аптымальнага, набліжанага да ўзорнага літаратурнага, выразнага штучнага маўлення.

Тое, як паслядоўна і абгрунтавана фанетычныя факты верыфікуюцца ў дысертацыі, дае падставы меркаваць, што вынікі даследавання могуць быць узяты за аснову пры далейшай распрацоўцы тэарэтычных і прыкладных праблем беларускай прасодыі ў параўнальна-супастаўляльным аспекце вывучэння інтанацыйных параметраў беларускай і іншых моў, стварэння сістэм сінтэзу маўлення. Палажэнні, вынесеныя на абарону, аргументавана раскрываюцца і пераканаўча даказваюцца ў адпаведных главах.

Аргументаванасць і верагоднасць заключаных вывадаў грунтуецца на падрабязным і несупярэчлівым змястоўным аналізе айчынных і замежных навуковых крыніц, розных поглядаў і падыходаў, іх інтэрпрэтацыі ў адпаведнасці з асаблівасцямі беларускага маўленчага прадукта. Дастатковым для атрымання верагодных вынікаў з'яўляецца аб'ём даследаванага фактычнага матэрыялу, прыцягнутага для аналізу.

Высновы і рэкамендацыі, сфармуляваныя ў дысертацыі, маюць эвалюцыйны характар, могуць паспяхова прымяняцца ў навучанні, характарызуюцца дакладнасцю, паўнатой і строгай суаднесенасцю з аб'ектам і прадметам даследавання.

Мяркуючы па аўтарэфераце, дысертацыя адносіцца да ліку наватарскіх даследаванняў, якія ўзбагачаюць уяўленні аб спецыфічных і агульных рысах фанетыкі беларускай мовы, камп'ютарнай і корпуснай лінгвістыкі. Праца з'яўляецца завершаным, сур'ёзным і арыгінальным навуковым даследаваннем, у якім на высокім навуковым узроўні вырашаюцца пастаўленыя задачы.

У сувязі з гэтым лічу, што аўтар дысертацыі "Лінгваакустычныя рэсурсы для беларускамоўных сістэм сінтэзу маўлення: фарміраванне, прагматычны патэнцыял, спосабы аптымізацыі" Я.С.Зяноўка заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасцях 10.02.01 – беларуская мова, 10.02.21 – прыкладная і матэматычная лінгвістыка.

Доктар філалагічных навук,
прафесар кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта,
прафесар В.І.Іўчанкаў

21 красавіка 2025 года

ПОДПИСЬ УДОСТОВЕРЯЮ
Начальник управления
организационной работы и
документационного обеспечения
Н.Б. Черкасская
20 25